«Алёнка»), вельмі мужная, смелая, сапраўдная патрыётка. Кожны ўвасобіў і каханую дзяўчыну (П. Броўка: «Пахне чабор», «З юнацкіх дзён», «Ветраная»; А. Куляшоў: «Чараўніца», «Песня лістаносца», «Бывай»). Яна розная: загадкавая і прыгожая, верная і каханая, любая і дарагая.

Як бачна, вобраз жанчыны набыў вельмі разнастайнае выяўленне ў творчасці П. Броўкі і А. Куляшова. Кожны паэт па-свойму ўяўляе сваю гераіню, надзяляючы яе ўсімі лепшымі якасцямі.

**Літаратура**

1 Панчанка, П. Белыя яблыні / П. Панчанка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://lit-bel.org/news/Shchiri-shchodri-chalavechni--goddze-Pmena-Panchank-7891/ – Дата доступу : 10.04.2020.

***А. А. Игнатьева***
*Науч. рук.* ***Е. Ф. Асенчик,***
*ст. преподаватель*

## КОНЦЕПТ «ЧУДО» В РУССКОЙ ЯЗЫКОВОЙ КАРТИНЕ МИРА

Концепт «чудо» является важной частью русской лингвокультуры и имеет продолжительную историю формирования и развития. Его можно назвать национально специфичным, поскольку его возникновение и развитие обусловлено особенностями религиозного сознания славян. Согласно теистической концепции, «чудо – это сверхъестественное непостижимое событие, нарушающее известные законы природы и случающееся как проявление всемогущества Бога (обычно в ответ на усиленную молитву, соприкосновение со святыней и т. п.)» [1, с. 266].

Ключевая лексема-репрезентант концепта – слово *чудо*. По данным «Словаря русского языка» А. П. Евгеньевой, исходное значение лексемы в русском языке – «сверхъестественное явление, вызванное вмешательством божественной, потусторонней силы», вторичные значения слова следующие: «нечто небывалое, необычное, то, что вызывает удивление»; то, что «вызывает восхищение своими качествами»; а также «сказочное необыкновенное существо» [2].

В фольклорной традиции *чудо* может выражать различные смыслы, не всегда сходные с христианским наполнением данного концепта, т. е. реализует как раз вторичные значения, зафиксированные в словарях (событие, вызванное воздействием нечистой силы; объект с феноменальными природными свойствами; место, где осуществляются действия магического характера): *Такие **чудеса**, что дыбом волоса; **Чудеса** в решете: дыр много, а вылезть негде (а выскочить некуда); Чудные **чудеса** – шилом небеса; Эки **чудеса**: передок везу, задок сам катится; **Диковина** еж, а и его много; Хорошая нива – всякому в **диво**; Вот **диво**: черная коровка, белое молочко; Чего мало, то и в **диковину**; Эка **невидаль**, что каша естся.* Как видно из примеров, именно в паремиях лексема *чудо* нередко употребляется во множественном числе – *чудеса* – и коррелируется в значении с лексемами *диво, диковина, невидаль, небывальщина*.

Анализ данных поэтического корпуса РЯ [3] показал активное использование лексемы *чудо* в русской поэзии всего XX в. (найден 2 381 документ, 3 090 вхождений). Поэтические тексты отражают все перечисленные значения, связанные как с религиозной, так и с мифологической, фольклорной сферами концепта: *Не прося о невозможном **чуде**, Отлетая, молится: да будет На закате стынущего дня Воля Сотворившего меня!* (Л. А. Алексеева); *И я говорил: «С добрым утром, сударушка, Все **чуда** земные – в твоем рукаве…»* (В. Блаженный).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

В результате сравнительного анализа текстов христианской литературы, паремий и поэтических текстов можно отметить, что феномен чуда имеет место как в народном, так и сакральном дискурсе, что и представляет особый интерес.

## Литература

1 Скляровская, Т. А. Словарь православной церковной культуры / Т. А. Скляревская. – Москва : АСТ: Астрель. 2008. – 480 с.

2 Новый словарь русского языка. Толково-словообразовательный / под ред. Т. Ф. Ефремовой [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://www.efremova.info. – Дата доступа : 24.03.2020.

3 Национальный корпус русского языка [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.ruscorpora.ru. – Дата доступа : 16.04.2020.

***А. С. Кавалёў***
*Навук. кір.* ***А. В. Брадзіхіна,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## ІДЭЙНА-МАСТАЦКІЯ АСАБЛІВАСЦІ АПОВЕСЦІ «АПЛАДНЕННЕ ЁЛУПА» Ю. СТАНКЕВІЧА

Сюжэт аповесці «Аппладненне ёлупа» Ю. Станкевіча грунтуецца на падзеях вакол будаўніцтва Палаца Праўдадыра, што павінен стаць самай высокай у свеце постаццю ў выглядзе яго гіганцкай фігуры. Аповесць у кампазіцыйна-структурным плане падаецца ў форме дзённіка галоўнага героя, яна шматаспектная па змесце, з элементамі містыкі і дакументалізму аднначасова. Пісьменнік не баіцца ні глыбока зазірнуць ва ўнутраны свет чалавека, які не ў стане адшукаць паратунак ад самога сябе, ні стварыць перспектыву будучыні, якая не абяцае нічога добрага. Як і ў іншых сваіх творах, Ю. Станкевіч абвастрае наша разуменне навакольнай рэчаіснасці, стварае адчуванне непазбежнасці катастрофы. Героі спрабуюць супрацьстаяць гэтаму, хоць і ўсведамляюць бессэнсоўнасць свайго пратэсту, які, аднак, неабходны ім дзеля апраўдання сваёй часовай зямной прысутнасці. «Бо Ю. Станкевіч не гуляе і не збіраецца гуляць з чытачом у аніякія папулярныя гульні – ні гастранамічныя, ні ідэалагічныя, дзе найпрасцей схлусіць чалавеку альбо прыўкрасіць ягоную рэчаіснасць, чым адкрыць вочы на Зло, якому немагчыма не супрацьстаяць, каб выжыць, даючы, можа, апошні шанец Дабру на абарону чалавечнага ў чалавеку, родавага ў народзе, нацыянальнага ў айчынным...» [1], – трапна зазначае Л. Галубовіч.

У большасці твораў Ю. Станкевіч не пакідае героям шансаў на выратаванне. Нягледзячы на неспрыяльныя жыццёвыя абставіны і няспынныя паразы лёсу, герой аповесці Марка Ласкоў – інжынер, выхадзец з Беларусі, бацька якога быў рэпрэсаваны – да апошняга абараняе ўласныя прынцыпы, без чаго не пачуваецца паўнавартасным прадстаўніком чалавечага роду. Ён вырашае сабатаваць будаўніцтва Палаца Праўдадыра, праекціроўкай якога займаўся: «Так ці інакш гэты вар'яцкі праект павінен быў знішчыць мяне ці духоўна, ці ўвогуле фізічна. Альбо я яго. Пытанне ставілася рубам: дазволю я ўкараніцца сатанінскім сімвалам, якія сканцэнтраваліся ў выглядзе гіганцкага пачварнага ідала, ці не?» [2, с. 362]. Матыў несвабоды ў савецкім грамадстве гучыць на працягу твора. Палац Праўдадыра, на думку Марка Ласкова, з'яўляецца поўнай супрацьлегласцю паняццю «свабода» – увасабленнем рабства. Ю. Станкевіч называе ідалаў ёлупамі, якія робяцца аб'ектам пакланення. З ёлупам Марка параўноўвае і статую Праўдадыра. Герой твора паўстае супраць любых ідалаў, бо нават ненаўмыснае іх стварэнне, а тым больш – наданне ім яўнай велічы, абарочваецца супраць чалавека, робіць з яго служку-выканаўцу пачварных ідэй Праўдадыра.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ